ПАСТАНОВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА СТАТЫСТЫЧНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
30 жніўня 2017 г. № 103

# Аб зацвярджэнні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-музей (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці музея» і ўказанняў па яе запаўненні

Изменения и дополнения:

Постановление Национального статистического комитета Республики Беларусь от 25 октября 2018 г. № 113 (зарегистрировано в Национальном реестре - № 7/4159 от 31.10.2018 г.) <T21804159p>

На падставе Палажэння аб Нацыянальным статыстычным камітэце Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 жніўня 2008 г. № 445 «О некоторых вопросах органов государственной статистики», Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць па прадстаўленні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прыкладзеныя:

1.1. форму дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-музей (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці музея» гадавой перыядычнасці і ўвесці яе ў дзеянне пачынаючы са справаздачы за 2017 год;

1.2. Указанні па запаўненні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-музей (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці музея» і ўвесці іх у дзеянне пачынаючы са справаздачы за 2017 год.

2. Распаўсюдзіць указаную ў падпункце 1.1 пункта 1 дадзенай пастановы форму дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці на юрыдычныя асобы, якія з’яўляюцца музеямі або ў структуру якіх уваходзяць музеі.

3. Прызнаць страціўшай сілу пастанову Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь ад 29 верасня 2016 г. № 133 «Аб зацвярджэнні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-музей (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці музея» і ўказанняў па яе запаўненні» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 12.10.2016, 7/3597).

4. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу праз пятнаццаць рабочых дзён пасля яе падпісання.

**Старшыня** **І.В.Мядведзева**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Нацыянальнага
статыстычнага камітэта
Рэспублікі Беларусь
30.08.2017 № 103

**ДЗЯРЖАЎНАЯ СТАТЫСТЫЧНАЯ СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ**

Прадстаўленне скажоных даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, несвоечасовае прадстаўленне або непрадстаўленне такой справаздачнасці цягнуць прымяненне мер адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

# СПРАВАЗДАЧА
## аб дзейнасці музея
за 20____ год

| Прадстаўляюць | Тэрмін прадстаўлення |
|---|---|
| юрыдычныя асобы, якія з’яўляюцца музеямі, або ў структуру якіх уваходзяць музеі: | |
| дзяржаўнай формы ўласнасці, падпарадкаваныя структурным падраздзяленням мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры | |
| структурнаму падраздзяленню абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры | 15 студзеня |
| дзяржаўнай формы ўласнасці, падпарадкаваныя Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь, іншым дзяржаўным органам і іншым дзяржаўным юрыдычным асобам | 25 студзеня |
| прыватнай формы ўласнасці | 25 студзеня |
| Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь | |
| структурныя падраздзяленні абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, – агрэгаваныя першасныя статыстычныя даныя | 25 студзеня |
| Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь | |
| Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь – афіцыйную статыстычную інфармацыю | 15 лютага |
| Нацыянальнаму статыстычнаму камітэту Рэспублікі Беларусь | |

| Форма 1-музей (Мінкультуры) | |
|---|---|
| Код формы па ОКУД | 0629507 |
| | |

Гадавая

Поўная назва юрыдычнай асобы____________________
Паштовы адрас (фактычны)____________________
Электронны адрас (www, e-mail)____________________

| Рэгістрацыйны нумар рэспандэнта ў статыстычным рэгістры (ОКПО) | Уліковы нумар плацельшчыка (УНП) | Код профіля музея: 1 – гістарычны, 2 – комплексны, 3 – прыродазнаўчы, 4 – мастацкі, 5 – літаратурны | Код мясцовасці, дзе знаходзіцца музей: 1 – горад і паселак гарадскога тыпу, 2 – сельскі населены пункт |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| | | | |

## РАЗДЗЕЛ I
## МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА НА КАНЕЦ СПРАВАЗДАЧНАГА ГОДА

Табліца 1

| Код радка | Колькасць будынкаў, адзінак | З іх колькасць помнікаў архітэктуры | Агульная плошча тэрыторыі, га | Плошча памяшканняў – усяго, м $^2$ | З іх – плошча памяшканняў | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | пад пастаянныя экспазіцыі | пад часовыя экспазіцыі | пад захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў | патрабуючых капітальнага рамонту | маючых аварыйны стан |
| А | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 01 | | | | | | | | | |

## РАЗДЗЕЛ II
## ХАРАКТАРЫСТЫКА МУЗЕЙНАГА ФОНДУ

Табліца 2

адзінак

| Тыпы музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў | Код радка | Колькасць музейных прадметаў асноўнага фонду на канец справаздачнага года | З іх колькасць музейных прадметаў асноўнага фонду, якія патрабуюць рэстаўрацыі | Колькасць музейных прадметаў асноўнага фонду, якія набыты ў справаздачным годзе | Колькасць музейных прадметаў асноўнага фонду, якія ўнесены ў электронны каталог | З іх унесены ў справаздачным годзе | Колькасць прадметаў фонду навукова-дапаможных матэрыялаў на канец справаздачнага года | Колькасць прадметаў фонду сыравінных матэрыялаў на канец справаздачнага года |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А | Б | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| Усяго (сума радкоў з 03 па 08)……................... | 02 | | | | | | | |
| у тым ліку: | | | | | | | | |
| рэчавыя......................................................... | 03 | | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| пісьмовыя...................................................... | 04 | | | | | | | |
| выяўленчыя.................................................. | 05 | | | | | | | |
| аўдыявізуальныя........................................... | 06 | | | | | | | |
| прыродазнаўчагістарычныя......................... | 07 | | | | | | | |
| архітэктурныя................................................ | 08 | | | | | | | |
| З радка 02: | | | | | | | | |
| прадметы з каштоўных металаў і каштоўных камянёў.................................... | 09 | | | | | | | |
| зброя............................................................... | 10 | | | | | | | |

## РАЗДЗЕЛ III
## КОЛЬКАСЦЬ НАВЕДВАННЯЎ МУЗЕЯ

Табліца 3

чалавек

| Код радка | Колькасць наведванняў музея (сума граф 2 і 8) | Колькасць наведванняў пастаянных і часовых экспазіцый | | З графы 2 | | | | Колькасць наведванняў культурна-адукацыйных мерапрыемстваў | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго (сума граф 4 і 5; сума граф 6 і 7) | з іх навучэнцамі ўстаноў агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі | экскурсійных | індывідуальных | платных | бясплатных | усяго | у тым ліку | |
| | | | | | | | | | платных | бясплатных |
| А | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | | | | | | | | | | |

## РАЗДЗЕЛ IV
## ЗВЕСТКІ АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Табліца 4

адзінак

| Код радка | Колькасць часовых экспазіцый – усяго | З іх экспанаваных у справаздачным годзе па-за музеем | Колькасць экскурсій | Колькасць культурна-адукацыйных мерапрыемстваў |
|---|---|---|---|---|
| А | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 12 | | | | |

Кіраўнік рэспандэнта або ўпаўнаважаны
на складанне і прадстаўленне першасных
статыстычных даных, работнік рэспандэнта ______________________________ ____________ ____________________
(пасада) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

________________________________________________________ ___ ____________________ 20___ г.
(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку кантактнай асобы,
нумар тэлефона, адрас электроннай пошты)

(дата складання дзяржаўнай статыстычнай
справаздачнасці)

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Нацыянальнага
статыстычнага камітэта
Рэспублікі Беларусь
30.08.2017 № 103

**УКАЗАННІ**
**па запаўненні формы дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 1-музей (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці музея»**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дзяржаўную статыстычную справаздачнасць па форме 1-музей (Мінкультуры) «Справаздача аб дзейнасці музея» (далей – справаздача) прадстаўляюць юрыдычныя асобы, якія з’яўляюцца музеямі або ў структуру якіх уваходзяць музеі (далей – музеі).

2. Музеі, часова закрытыя для наведвання па розных прычынах (рамонт, замена экспазіцыі, выкарыстанне памяшканняў у іншых мэтах), запаўняюць паказчыкі, якія адпавядаюць іх дзейнасці за справаздачны перыяд.

Музеі, адкрытыя пасля капітальнага рамонту і рэканструкцыі запаўняюць усе раздзелы справаздачы.

3. У графе 3 рэквізіта «Звесткі аб рэспандэнце» указваецца код профілю музея, які абумоўлены прыналежнасцю музея да той ці іншай профільнай навуковай дысцыпліны:

1 – гістарычны. Да гэтага профілю адносяцца агульнагістарычныя, ваенна-гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя, гісторыі рэлігіі, гістарычныя манаграфічныя, сучаснай культуры, іншыя гістарычныя музеі;

2 – комплексны. Да гэтага профілю адносяцца музеі, якія сумяшчаюць прыкметы некалькіх профіляў. Да комплексных музеяў адносяцца мемарыяльныя комплексы, гісторыка-мастацкія, краязнаўчыя музеі, музеі архітэктуры і этнаграфіі, гісторыка-культурныя запаведнікі, іншыя музеі;

3 – прыродазнаўчы. Да гэтага профілю адносяцца прыродазнаўчыя музеі шырокага профілю, геаграфічныя, біялагічныя, заалагічныя, батанічныя, геалагічныя, мінералагічныя, антрапалагічныя, іншыя прыродазнаўчыя музеі;

4 – мастацкі. Да гэтага профілю адносяцца музеі выяўленчых мастацтваў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнага мастацтва, палацавага і паркавага мастацтва, мастацкія манаграфічныя, іншыя мастацкія музеі;

5 – літаратурны. Да гэтага профілю адносяцца музеі гісторыі літаратуры, гісторыі кнігі, літаратурныя манаграфічныя, іншыя літаратурныя музеі.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК ЗАПАЎНЕННЯ РАЗДЗЕЛА І «МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА НА КАНЕЦ СПРАВАЗДАЧНАГА ГОДА»

4. У графе 1 паказваецца агульная колькасць будынкаў, адведзеных пад асноўныя, дапаможныя, службовыя і іншыя памяшканні, у тым ліку і арандаваных, акрамя ўласных будынкаў, цалкам здадзеных у арэнду.

5. У графе 3 паказваецца агульная плошча тэрыторыі музея (зямельная), якая ўключае плошчу паркаў, садоў і іншых тэрыторый, якія знаходзяцца ў карыстанні музея.

6. У графе 4 паказваецца плошча ўсіх памяшканняў, якая ўключае ў сябе плошчу, адведзеную пад экспазіцыі (пастаянныя, часовыя), пад захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, плошчу дапаможных, службовых і іншых памяшканняў, як ва ўласных, так і ў арандаваных будынках незалежна ад таго, знаходзяцца яны па аднаму ці па некалькіх адрасах. Плошчы памяшканняў, якія здаюцца ў

арэнду, не паказваюцца. Звесткі аб памеры плошчы памяшканняў паказваюцца на аснове тэхнічнага пашпарта ці дагавору арэнды.

7. У графах 5 і 6 паказваецца плошча памяшканняў, адведзеная для пастаянных і часовых экспазіцый адпаведна. Экспазіцыйныя плошчы паказваюцца толькі для будынкаў. Плошча часовых і пастаянных экспазіцый на адкрытай тэрыторыі, уключаючы ўкрытыя навесам, у экспазіцыйную плошчу не ўваходзіць.

8. У графе 7 паказваецца плошча, якая выкарыстоўваецца пад захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў і ўключае ў сябе плошчу памяшканняў для часовага захоўвання паступіўшых матэрыялаў, плошчу фондасховішчаў з комплексным захоўваннем ці па відах матэрыялаў, плошчу, адведзеную пад адкрытае захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, а таксама плошчу службовых памяшканняў для супрацоўнікаў фондавых аддзелаў, якія не выдзелены з фондасховішчаў.

9. Графы 8 і 9 запаўняюцца на падставе акта (заключэння) ці складзенага ва ўстаноўленым парадку іншага дакумента, які характарызуе стан уласных (не арандаваных) памяшканняў.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК ЗАПАЎНЕННЯ РАЗДЗЕЛА II «ХАРАКТАРЫСТЫКА МУЗЕЙНАГА ФОНДУ»

10. Даныя па радках з 03 па 08 прыводзяцца згодна з пунктам 7 артыкула 155 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

11. Па радку 03 паказваюцца даныя па рэчавых відах музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, да якіх адносяцца археалагічныя артэфакты, нумізматыка, баністыка, фалерыстыка, сфрагістыка, зброя, ахоўнае ўзбраенне, боепрыпасы, вайсковы рыштунак і атрыбутыка, адзенне, тканіны, вексілалогія, мэбля, музычныя інструменты, прыборы, апараты, інструменты, механізмы, транспартныя сродкі, прылады і прыстасаванні, прадметы побыту і іншыя рэчавыя віды.

12. Па радку 04 паказваюцца даныя па пісьмовых відах музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, да якіх адносяцца дакументы, рукапісы, друкаваныя выданні і іншыя пісьмовыя віды.

13. Па радку 05 паказваюцца даныя па выяўленчых відах музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, да якіх адносяцца скульптура, жывапіс, графіка, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і іншыя выяўленчыя віды.

14. Па радку 06 паказваюцца даныя па аўдыявізуальных відах музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў, да якіх адносяцца фона-, фота-, кіна-, відэадакументы і іншыя аўдыявізуальныя віды.

15. Па радку 07 паказваюцца даныя па прыродазнаўчагістарычных відах музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, да якіх адносяцца біялагічныя, геалагічныя аб’екты і іншыя прыродазнаўчагістарычныя віды.

16. Па радку 08 паказваюцца даныя па архітэктурных відах музейных прадметаў, да якіх адносяцца капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні) і іншыя архітэктурныя віды.

17. Сума даных па радках з 03 па 08 павінна быць роўнай даным па радку 02.

18. Па радку 09 паказваецца колькасць прадметаў, якія цалкам ці часткова выраблены з каштоўных металаў ці каштоўных камянёў і знаходзяцца на спецыяльным уліку.

19. Графа 2 запаўняецца на падставе прафілактычных аглядаў музейных прадметаў ці па матэрыялах зверкі наяўнасці музейных прадметаў з уліковымі дакументамі на падставе пратакола фондава-закупачнай камісіі.

20. Графа 6 запаўняецца на падставе даных кнігі ўліку фонду навукова-дапаможных матэрыялаў.

## ГЛАВА 4
## ПАРАДАК ЗАПАЎНЕННЯ РАЗДЗЕЛА III «КОЛЬКАСЦЬ НАВЕДВАННЯЎ МУЗЕЯ»

21. У графе 1 паказваецца агульная колькасць наведванняў музея, якая складаецца з колькасці наведванняў пастаянных і часовых экспазіцый музея і колькасці наведванняў культурна-адукацыйных мерапрыемстваў.

Даныя ў графе 1 павінны быць роўныя суме даных у графах 2 і 8.

22. У графе 2 паказваецца агульная колькасць наведванняў пастаянных і часовых экспазіцый музея як экскурсійных, так і індывідуальных. Музеі-запаведнікі ў графе 2 паказваюць таксама экскурсійныя наведванні аб'ектаў, якія размешчаны на іх тэрыторыі.

Колькасць наведванняў экспазіцый паказваецца на падставе ўваходных білетаў (платных ці бясплатных) і даных кнігі ўліку экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў музея, калі ўваходны білет не выдаваўся.

Даныя ў графе 2 павінны быць роўныя суме даных у графах 4 і 5, а таксама суме даных у графах 6 і 7.

23. У графе 6 паказваецца колькасць платных наведванняў пастаянных і часовых экспазіцый, якая вызначаецца па колькасці платных уваходных білетаў і па запісах у кнізе ўліку экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў музея, калі на групу чалавек прадаваўся экскурсійны білет (пуцёўка).

24. У графе 8 паказваецца колькасць наведванняў культурна-адукацыйных мерапрыемстваў, якая вызначаецца на падставе даных журнала ўліку культурна-адукацыйных мерапрыемстваў і па білетах.

Даныя ў графе 8 павінны быць роўныя суме даных у графах 9 і 10.

## ГЛАВА 5
## ПАРАДАК ЗАПАЎНЕННЯ РАЗДЗЕЛА IV «ЗВЕСТКІ АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ»

25. У графе 1 паказваецца колькасць часовых экспазіцый, якія праведзены ў справаздачным годзе ў будынку музея і экспанаваліся па-за музеем.

У графе 2 паказваюцца часовыя экспазіцыі, якія экспанаваліся па-за музеем.

У выпадку, калі музей арганізоўваў часовую экспазіцыю ў іншым музеі, даныя аб створаных экспазіцыях паказваюць абодва музеі, але колькасць наведванняў паказвае той музей, які гэту эскпазіцыю экспанаваў, на падставе ўваходных білетаў (платных ці бясплатных) і даных кнігі ўліку экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў музея.

26. У графе 3 паказваецца колькасць экскурсій, праведзеных за справаздачны перыяд. Колькасць экскурсій вызначаецца па білетах (пуцёўках) на экскурсійнае абслугоўванне і на падставе даных кнігі ўліку экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў музея, калі экскурсіі бясплатныя.

27. У графе 4 паказваецца колькасць культурна-адукацыйных мерапрыемстваў, да якіх адносяцца ўсе формы мерапрыемстваў, якія выкарыстоўвае музей: лекцыі, музейна-педагагічныя заняткі, культурна-адукацыйныя праграмы, канцэрты і іншыя. Калі музей арганізоўвае цыклы, абанементы лекцый (заняткаў), тады кожная лекцыя (занятак) паказваецца як адно мерапрыемства.

Заўвага. Тэрміналогія, якая прымяняецца ў гэтых Указаннях, выкарыстоўваецца толькі для запаўнення справаздачы.